# НАША СЛАВА

З нашай мясцовасці выйшаў і стаў вядомым... Сяло наша можа ганарыцца многімі сваімі нараджэнцамі, якія дасягнулі вядомасці ў розных галінах.

Пачнем з Аляксандра Восіпавіча Акінчыца (28.01.1839 – 18.03.1886). У 1856–1861 гады А. Акінчыц вучыўся ў Пружанах, Гародні, на медыцынскім факультэце Маскоўскага універсітэта. Працаваў лекарам у мястэчку Шарашова на Пружаншчыне. Удзельнік паўстання 1863 года. У баі 14 мая 1863 года каля Гута-Міхаліна атрад Стравінскага, Самульскага і Акінчыца (292 чалавекі) супрацьстаяў дзвюм ротам і сотні казакоў расійскіх урадавых войск. Аляксандр Акінчыц выконваў у атрадзе і свой прафесійны абавязак — лячыў параненых.

За ўдзел у паўстанні Акінчыц атрымаў 15 гадоў катаргі. На этапе паміж Томскам і Табольскам уцёк. Жыў у Францыі, у Парыжы, дзе аддаўся палітычнай дзейнасці, здаў экзамен на доктара медыцыны. У 1867 годзе пераехаў у г. Віль, дзе займаўся лячэбнай практыкай да смерці. Заслужыў павагу з боку гараджан тым, што беднякоў лячыў без грошай. А. Акінчыц памёр ад эпідэміі, якая захліснула Віль.

А. Акінчыц з'яўляецца перапісчыкам найбольш ранняга з вядомых рукапісаў паэмы «Тарас на Парнасе». Знакамітая паэма напісана лацінкай на беларускай мове. Відаць, А. Акінчыц ведаў яе тэкст на памяць. Сама паэма будзе выдадзена пазней па яго тэксце.

У Акінчыца было пяцёра дзяцей. Адзначым яго сына Юзафа, які пайшоў па слядах бацькі і дасягнуў вяршынь у медыцынскай справе.

Сярод іншых Акінчыцаў, што нарадзіліся ў Сяльцы, назавём Тадэвуша Марыяна (1873–1939), які дасягнуў поспехаў у будаўніцтве паравозаў у Пецярбургу (Неўскі паравозабудаўнічы завод, дзе ён працаваў галоўным інжынерам), а пазней у Познані на заводзе Іпаліта Цагельскага.

Наступны, з кім мы пазнаёмімся, — Іосіф Карлавіч Здановіч. Нарадзіўся ў Сяльцы, адсюль разам з сям'ёй пераехаў у Маскву, служыў там у армейскім аркестры, у 1919–1922 гадах вучыўся ў Маскоўскай кансерваторыі, працаваў супрацоўнікам Інстытута музыкальнай навукі. Выдаў два зборнікі песень. Адзін з іх выклікае асаблівую цікавасць: гэта

запісаныя з голасу маці, Ганны Іосіфаўны, бытавыя песні мястэчка Сялец, якія ў нас называюць «брэдэшкамі», навукова — падабрадавая лірыка. Такія песні спявалі за межамі хаты, у час жніва, пасьбы і г. д.

Вось два ўрыўкі з тых песень.

У песні «Сусед сее» муж скардзіцца на лянівую жонку:

А ў суседа хата біла,
А ў суседа хата міла,
А ў мэнэ хата чорна,
Шэльма жонка нэмоторна.
Оно спіт да лежыт,
І ніц нэ хочэ робіть,
Оно спіт да лежыт,
І ніц нэ хочэ робіть.

А ў песні «Поехаў Сэмэн поле ораті…» расказваецца пра нявернасць жонкі, як яна абабрала мужа, чуецца праклён:

Ой, кінуўся Сэмэн
До новое скрыні:
Нэма срэбра, нэма злота,
Нэма і Катэрыны.
Повейтэ ветры
На сухія лозы!
Побій, Божэ, Катэрыну
За Сэмэна слёзы.

Другі зборнік І. К. Здановіча называўся «Рускія народныя песні». З'яўленне кнігі звязана з супрацоўніцтвам з папулярным хорам імя М. Я. Пятніцкага.

Цікавая біяграфія ў Мікалая Захаравіча Богдана (1901–1960). Скончыў настаўніцкую семінарыю, у пачатку 1920-х гадоў супрацоўнічаў з кіраўніцтвам БСРГ. У 1930-я гады рэдагаваў праўрадавую газету, пісаў вершы на польскай мове. Настаўнічаў у гады нямецкай акупацыі і ў савецкі час. Тыя, хто яго памятаў, казалі, што ведаў розныя мовы, а на нямецкай свабодна размаўляў. У сярэдзіне 1940-х гадоў выехаў на пастаяннае месца жыхарства ў Польскую Народную Рэспубліку, працаваў у Міністэрстве сельскай гаспадаркі, а пасля паслом у Чэхаславакіі. Памёр пры загадкавых абставінах у Празе.

Рычард Франкевіч нарадзіўся 22 красавіка 1931 года. Вучыўся ў Варшаве ў Інстытуце планавай статыстыкі, дзе